# ПАРАЎНАННЕ ПАШТОВЫХ СЭРВІСАЎ GMAIL І MAIL

*Аляксейчык Я.М.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Наўроцкая І.В. – старшы выкладчык*

У рабоце звернута ўвага пра значную ролю паштовых сэрвісаў у сучаснай камунікацыі, зроблена параўнальная характарыстыка паштовых кліентаў Gmail і Mail. Адзначаны варыянты інтэрфэйсу на нацыянальнай мове, якія выкарыстоўваюцца ў паштовых скрынях даследаваных сэрвісаў. Праведзены аналіз беларускамоўнага інтэрфэйсу паштовых скрынь адлюстроўвае сучасны стан іТ-тэрміналогіі на нацыянальнай мове.

У сучаснасці існуе шмат буйных паштовых сэрвюаў, дзякуючы якім камунікацыя стала больш зручнай і хуткай. Выкарыстанне электроннай пошты дае большую перавагу ў адрозненне ад традыцыйнай. Так, паштовыя кліенты дазваляюць імгненна адпраўляць паведамленні па ўсім свеце, што эканоміць час. Дзякуючы

паштовым скрыням можна захоўваць і класіфікаваць лісты, сэрвісы маюць убудаваныя фільтры і пошук, аўтаматызуюць адказы, адным словам, робяць работу з поштай больш зручнай, а таму прыемнай.

Для параўнання паспрабуем знайсці агульнае і адметнае ў паштовых сэрвісах Gmail [1] і Mail [2]. Mail належыць і кіруецца расійскай кампаніяй, Gmail належыць Google. Сэрвісы часта выкарыстоўваюцца як ў працоўных асяроддзях, так і прызначаюцца для асабістага выкарыстання. Gmail забяспечвае 15 ГБ бясплатнага сховішча на сваіх серверах для пошты, дыска Google і фатаграфій. Mail прапануе 5 ГБ бясплатнага сховішча для пошты і файлаў. Абедзве платформы забяспечваюць высокі ўзровень бяспекі, уключаючы абарону ад спаму, вірусаў і шыфравання даных. Акрамя гэтага, яны актыўна распрацоўваюць абарону карыстальнікаў, што забяспечвае іх надзейнасць.

Разгледзім, як далучыць файл ў названых папулярных сэрвісах, выкарыстоўваючы смартфон: у Gmail спачатку трэба зайсці на свой акаунт, у Mail трэба таксама ўвайсці ў свой уліковы запіс. Потым у абодвух кліентах трэба стварыць новы ліст, націснуўшы на кнопку «Напісаць» (Gmail), або “Напісаць ліст” (Mail). У адкрытым акне стварэння новага ліста неабходна знайсці значок сашчэпкі і націснуць на яго. Далей, выбраўшы варыянт «Далучыць файл», вам адкрыецца менеджар, у якім знаходзяцца файлы з вашай прылады. Выберыце файл, які вам патрэбны, і ён будзе далучаны да ліста.

Параўнаем таксама асноўныя кампаненты інтэрфэйсу паштовых кліентаў Mail і Gmail. Так, інтэрэфэйс Mail уключае ў сябе не толькі пошту, але і воблака, каляндар, нататкі, задачы і інш. У раздзеле “Пошта” прысутнічаюць наступныя ўкладкі: сацыяльныя сеткі (адлюстроўваюцца паведамленні, апавяшчэнні з сацсетак), рассылкі (адлюстравана тая інфармацыя, якую карыстальнік пагадзіўся атрымліваць ад пэўных кампаній), навіны, чэкі (прагляд чэкаў па плацяжах), дасланыя (лісты, якія былі дасланы на адрас атрымальніка), чарнавікі (пробныя лісты), архіў (непатрэбныя лісты), спам (лісты масавай расылкі), сметніца (лісты, якія патрабавалі выдалення), непрачытаныя (лісты, якія не былі прагледжаны), з флагам (адзначаныя лісты), з дадаткамі (лісты з далучанымі файламі).

У параўнанні з Mail паштовая скрыня Gmail у тым ліку мае некаторыя адметнасці ў інтэрфэйсе, які ўключае ў сябе наступныя ўкладкі: усе скрынкі (адлюстраванне ўсіх лістоў), галоўныя (найбольш важныя лісты), прома-акцыі (спецыяльныя прапановы ад кампаній), пазначаныя (выбраныя лісты), адкладзеныя (лісты, якія былі адкладзены на некаторы час), важныя (неабходныя лісты), запланавана (лісты, для адпраўкі якіх ёсць выбраны час), выходныя (гатовыя лісты), кантакты (адлюстраванне кантактаў).

Такім чынам, можна заўважыць, што інтэрфэйс сэрвісаў Mail і Gmail мае як агульныя прынцыпы сартавання лістоў (напрыклад, укладкі, якія датычацца сацыяльных сетак, чарнавікоў, спаму), а таксама даследаваныя паштовыя сэрвісы маюць і значныя адрозненні, пералічаныя вышэй.

Параўнаем беларускамоўны інтэрфэйс паштовых кліентаў Mail і Gmail і вылучым моўныя адрозненні, якія прадставім ў табліцы 1.

Табліца 1 – Моўныя адрозненні беларускамоўнага інтэрфэйсу Mail і Gmail

| Mail | Gmail |
|---|---|
| Дасланыя | Адпраўленыя |
| Скасаваць | Адхіліць |
| Тэчка | Папка |
| Сметніца. Вычысціць | Ачысціць сметніцу |
| У архіў | Архіваваць |

Як відаць з табліцы, беларускамоўны інтэрфэйс паштовых кліентаў Mail і Gmail утрымлівае словаўтваральныя (вычысціць і ачысціць), марфалагічныя (у архіў і архіваваць), сінанімічныя (дасланыя і адпраўленыя, тэчка і папка) адрозненні ў выбары моўнага матэрыялу. Праведзенае параўнанне пацвярджае думку навукоўцаў адносна развіцця сучаснай беларускай IT-тэрміналогіі, якой пакуль уласціва “абмежаванасць выкарыстання і адсутнасць кампетэнтных тэрміналагічных даведнікаў” [3], а праз гэта беларускамоўная тэрміналогія IT-галіны характарызуецца ўжываннем варыянтаў, сінонімаў для абазначэння адпаведных IT-паняццяў.

На падставе ўсяго вышэйсказанага можна ўпэўніцца, што паштовыя сэрвісы ўносяць значны ўклад у сучасную камунікацыю, у тым ліку на нацыянальнай мове праз выкарыстанне беларускамоўнага інтэрфэйсу. Паштовыя кліенты не толькі забяспечваюць зручнасць выкарыстання ліставання, але і даюць магчымасць зрабіць работу з поштай больш цікавай. Яны разнастайныя, але кожны па-свойму адметны. Аналіз беларускамоўнага інтэрфэйсу названых паштовых скрынь адлюстроўвае сучасны стан IT-тэрміналогіі на нацыянальнай мове.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1.Mail.google.com [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://mail.google.com – Дата доступу: 10.03.2024*

*2.Mail.ru [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://mail.ru – Дата доступу: 10.03.2024*

*3.Свістунова, М.І. Беларуская IT-тэрміналогія ў інтэрнэце: памылкі і варыянты / М.І. Свістунова [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/handle/123456789/248122 – Дата доступу: 25.03.2024*